

**8 лютага адзначым 100-годдзе з дня нараджэння Івана Мележа.**

Іван Паўлавіч Мележ нарадзіўся ў звычайнай сялянскай сям'і ў вёсцы Глінішча Хойніцкага раёна Гомельскай вобласці. У хлапчука было звычайнае вясковае дзяцінства і юнацтва.

З маленства І. Мележ убіраў у сябе не толькі хараство родных краявідаў. Ён засвойваў і маральныя законы, па якіх жылі землякі. Прыкладам жыццёвай мудрасці, дабраты і справядлівасці найперш была маці, простая сялянка. Марыя Дзянісаўна была родам з Каранёўкі, якая ведала шмат народных песень і любіла спяваць.

Згадваючы вытокі свайго шляху ў літаратуру, Іван Мележ пісаў: "Я нарадзіўся і вырас на Палессі. Гэты сапраўды цудоўны край і яшчэ болей цудоўныя яго людзі - палешукі - увайшлі ў маю свядомасць з таго часу, як я стаў помніць сябе... Я суткамі мёрз у акопах, а перад маімі вачамі стаяла маё гарачае Палессе. Я месяцамі валяўся ў шпіталях - у мяне ў галавах стаялі палешукі. Я пісаў раман пра вайну - яны стаялі за маімі плячамі, хвалюючы маё ўяўленне. І вось настаў дзень, калі я выразна адчуў: усё, больш не магу, трэба пісаць..."

"Раман пра вайну", згаданы Іванам Паўлавічам, - гэта "Мінскі напрамак", твор, які стаў адным з першых у нашай літаратуры панарамным палатном, прысвечаным Вялікай Айчыннай, а дакладней - вызваленню Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Створаны напрыканцы 40-х - на пачатку 50-х гадоў, ён вызначаўся сярод іншых твораў эпічнай паўнатой, цэласнасцю ўзнаўлення характараў і канкрэтных ваенных рэалій. Глыбокае веданне і асэнсаванне шматлікіх абставін і сітуацый, майстэрства апісання рэчаіснасці і пранікненне ў самую сутнасць гераізму, свядомы паказ маштабнасці баявых падзей вызваленчай барацьбы за Беларусь вясной і летам 1944-га- праявіўшы ўсё гэта пры рабоце над раманам, Іван Мележ здолеў рэальна і па-мастакоўску таленавіта ўславіць насамрэч бессмяротны подзвіг воінаў Чырвонай Арміі, партызан, падпольшчыкаў і мірнага насельніцтва падчас самага трагічнага выпрабавання.

А потым была "Палеская хроніка" - такі ж, а можа нават і яшчэ больш маштабны твор, у якім знайшла адлюстраванне адна з найважнейшых і традыцыйных тэм у беларускай літаратуры, - сялянская. Як ніхто з іншых беларускіх творцаў, Іван Паўлавіч змог данесці да чытачоў атмасферу і дух 20-х гадоў ХХ стагоддзя - часу, які стаў у гісторыі нашай Бацькаўшчыны як эвалюцыйна-абнаўляльным, так і супярэчліва-трагічным. Як зазначаў адзін з даследчыкаў творчасці Івана Паўлавіча, "стрыжань мележаўскіх раманаў -

паказ працэсу развіцця чалавека ў цесным адзінстве з сацыяльна-гістарычнай дэтэрмінаванасцю характараў..."

Мележаўская “Палеская хроніка” менавіта для мяне цесна пераплятаецца з Шолахоўскай “Узаранай цалiной”…

Шкада толькі, што трэці з раманаў "Палескай хронікі" - "Завеі, снежань" - застаўся незавершаным...

“Палеская хроніка” засталася нясканчанай. Дарэчы, Лідзія Пятрова-Мележ пісала, што яе муж разглядаў нават такі варыянт: позняе каханне Васіля і Ганны ці пачуцці паміж іх дзецьмі. Але гэтым планам так і не было наканавана збыцца.

Першыя дзве часткі "Палескай хронікі" - раманы "Людзі на балоце" і "Подых навальніцы" - былі ўганараваны вышэйшай савецкай літаратурнай узнагародай - Ленінскай прэміяй.

Іван Мележ быў таксама ўдастоены звання народнага пісьменніка Беларусі, лаўрэата Дзяржаўных прэмій СССР і БССР, узнагароджаны некалькімі ордэнамі і медалямі




**17 февраля отметим 115 -летие Агнии Барто.**

Её имя ежегодно входит в традиционный ТОП-10 наиболее издаваемых авторов детской литературы. Простые и понятные рифмы Барто малыши читают наизусть, едва научившись говорить.

На детских стихах Агнии Барто выросло не одно поколение, но творчество её не стареет. Агнию Барто можно смело назвать народной поэтессой, она удивительна и многогранна, никогда не повторяется, хотя стихи ее можно узнать по стилю из тысячи авторов. Агния Барто всегда говорила: «Детям нужна вся гамма чувств, рождающих человечность» и отражала суть этого высказывания в каждом своем стихотворении, искренне и с любовью.

— Стихотворение о мишке, которого уронили на пол, было одним из любимых детских воспоминаний Юрия Гагарина. Именно его он процитировал от руки на листочке бумаги, когда брал автограф у поэтессы. «*Это первая книга о добре в моей жизни*», — признался космонавт.

Давайте вспомним некоторые строки из нашего детства:

***Наша Таня громко плачет:***
***Уронила в речку мячик. –***
***Тише, Танечка, не плачь:***
***Не утонет в речке мяч.***

***

***Зайку бросила хозяйка –***
***Под дождем остался зайка.***
***Со скамейки слезть не мог,***
***Весь до ниточки промок.***

***

***Матросская шапка,***
***Веревка в руке,***
***Тяну я кораблик***
***По быстрой реке,***
***И скачут лягушки***
***За мной по пятам***
***И просят меня:***
***- Прокати, капитан!***

***

***Уронили мишку на пол,***
***Оторвали мишке лапу.***
***Все равно его не брошу –***
***Потому что он хороший.***

Однако детские стихи, нежно любимые многими поколениями читателей, — не единственное большое дело в жизни Агнии Львовны. Она писала и киносценарии – в частности, благодаря ее соавторству с Риной Зеленой появился замечательный фильм «Подкидыш», снятый на студии «Мосфильм» в 1939 году режиссёром Татьяной Лукашевич по сценарию Фильм стал первой заметной киноработой для Ростислава Плятта; в картине также снимались такие замечательные актёры, как Фаина Раневская, Пётр Репнин, Ольга Жизнева.

Биография Агнии Барто незаурядна и спорна, интересна и увлекательна. И невзирая на её суровую гражданскую позицию, творчество поэтессы пронизано любовью к детям и пониманием их проблем. Именно поэтому Барто до сих пор остается наиболее издаваемым автором для маленьких читателей. А книга Агнии Львовны — лучший подарок и друг для ребенка.